# Шарашоўскія традыцыі (http://www.budni.by/?p=18195)

*Пятница, 19.08.2016 14:36. Рубрика: Сельские мотивы. Просмотров: 500*

**Звычайна свята пасёлка праводзіцца ў Шарашове незадоўга да пачатку навучальнага года. Не адышлі ад традыцыі і сёлета.**



Старшыня Шарашэўскага сельвыканкама Дзмітрый Уладзіміравіч Чайкоўскі павіншаваў жыхароў са святам, падзякаваў усім, хто імкнецца зрабіць пасёлак прыгожым і ўтульным. Лепшым гаспадарам, чые сядзібы ўтрымліваюцца ва ўзорным парадку, былі ўручаны падарункі.


Традыцыйна на сцэну выйшлі бацькі з немаўлятамі. Пасля мінулагодняга свята насельніцтва Шарашова пабольшала на 19 малышоў. А дзеткі, якія ў верасні пойдуць у першы клас, ужо самі трымалі слова: чыталі вершыкі і абяцалі, што будуць старанна вучыцца. Дарэчы, сцэна была ўпрыгожана букетамі гладыёлусаў, гэта мясцовы кветкавод Анастасія Уладзіміраўна Аляхновіч вырашыла парадаваць землякоў цудоўнымі кветкамі.



На гэты раз вядучай праграмы была малады спецыяліст Цэнтра культуры і вольнага часу Іна Рыпінская. Са сваімі абавязкамі яна справілася цудоўна, у дадатак, парадавала жыхароў пасёлка песнямі. А ў святочным канцэрце, які падрыхтавалі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці, прагучалі любімыя многімі музычныя кампазіцыі.  Завяршылася свята дыскатэкай.

Генадзь Фасевіч,

дырэктар Шарашоўскага Цэнтра культуры і вольнага часу.